№ 23 (376)
Чэрвень 2011 года

Краязнаўчая газета

Выдаецца з красавіка 2003 года

www.bfk.by

У нумары:

☞ Дзейнасць: *Любчанскі замак – справаздача* – стар. 2

☞ Тэорыя: *Літва – радзіма пермякоў?* – стар. 3

☞ Заклік: *раскажам пра бібліяфілаў!* – стар. 4

Удзельнікі гурта «Ярыца» з Магілёва

Фота Аляксея ГАЛІЧА

На тым тыдні...

✓ У Беларускім дзяржаўным музеі Вялікай Айчыннай вайны працуе **выстаўка фотаздымкаў Ларысы Салодкінай «Творцы Перамогі»**, прымеркаваная да ўгодкаў пачатку Вялікай Айчыннай вайны. Аўтар – лаўрэат Рэспубліканскай прэміі Саюза журналістаў «Залатое пяро». У экспазіцыі прадстаўленыя партрэты людзей, чыё жыццё стала подзвігам і легендай, гэта – ветэраны вайны, нашыя дзяды і бацькі, творцы Перамогі. Назвы працаў кажуць самі за сябе: «Салдат», «Салдацкая каша», «На ўсё жыццё», «Нашы дарагія бацькі»... Арганізатары выстаўкі – Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Беларускі дзяржаўны музей Вялікай Айчыннай вайны, Беларускае грамадскае аб'яднанне ветэранаў.

✓ У мястэчку Крэва Смаргонскага раёна **4 чэрвеня** з'явіўся новы помнік – **«Дрэва Паэзіі»**. Ініцыятары незвычайнай акцыі, беларускія літаратары, сябры беларускага ПЭН-цэнтра абралі на гэтую «пасаду» грушу, што гадоў трыццаць узвышаецца на пагорку на ўскраіне мястэчка. І прысвяцілі памятнае Дрэва вядомаму паэту, песенніку, празаіку Уладзіміру Някляеву. Пад грушай усталяваны гранітны камень з памятнаю шыльдай. Пад час імпрэзы літаратары чыталі вершы і спявалі песні, краязнаўцы распавядалі пра багатую спадчыну Крэва. У планах – зрабіць акцыю штогадовай і стварыць усё больш паэтычных дрэваў, прысвечаных класікам і сучасным пісьменнікам, ладзіць там літаратурныя імпрэзы.

✓ **10 чэрвеня** ў Беларускім дзяржаўным музеі народнай архітэктуры і побыту прайшла **канцэртная праграма «Чароўная ноч класікі ў музеі пад адкрытым небам»**. На адной канцэртнай сцэне выступілі найлепшыя галасы Беларусі і Расіі – салісты Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўнага акадэмічнага Вялікага тэатра Расіі, Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага музычнага тэатра, санкт-пецярбургскага Марыінскага тэатра.

Падрабязней пра імпрэзу чытайце ў наступным нумары.

Юбілей добрага казачніка са Случчыны

16 мая споўнілася 100 гадоў з дня нараджэння дзіцячага пісьменніка, заснавальніка часопіса «Вясёлка» Васіля Віткі (Цімоха Васільевіча Крысько; 1911–1996).

Юбілей слыннага паэта, казачніка, мудрага настаўніка, вернага сябра дзяцей Васіля Віткі – зручны час, каб яшчэ раз асэнсаваць значэнне яго творчасці і аддаць даніну яго памяці, ушанаваць яго імя.

Эстафету Васіля Віткі годна нясуць вясёлкаўцы, якія ў сваёй паўсядзённай працы нястомна шчыруюць, каб часопіс, як таго хацеў яго «бацька», вучыў маленькіх чытачоў шчыра любіць сваю Айчыну – Беларусь і родную мову. «Вясёлка» заснавала прэмію імя Васіля Віткі і медаль з яго выявай, якім штогод узнагароджваюцца вядомыя пісьменнікі, кампазітары і мастакі за лепшыя творы для дзяцей. З нагоды юбілею «Вясёлка» з пачатку года знаёміла чытачоў з яго жыццём і творчасцю, праводзіла сустрэчы з сябрамі часопіса. А напярэдадні юбілею і пасля яго адбыліся святочныя мерапрыемствы на радзіме пісьменніка – Случчыне і ў Мінску (аб адным з іх «КГ» ужо распавядала).

На Случчыне чацвёрты год запар ладзіліся Віткаўскія чытанні. На працягу тыдня праходзілі мерапрыемствы ў бібліятэках і школах, у вёсцы Акцябр закладзеная алея памяці Васіля Віткі. У Мінскі аблвыканкам пададзенае хадайніцтва аб прысваенні яго імя школе на радзіме і вуліцы ў Слуцку.

Рашэннем Мінскага гарвыканкама ад 28 красавіка шостай дзіцячай бібліятэцы нашай сталіцы прысвоенае імя Васіля Віткі. З гэтай нагоды ў дзень народзінаў класіка ў бібліятэцы адбылося свята і ўрачыстае адкрыццё філіяла музея «Вясёлкі», на якім прысутнічала дачка пісьменніка Наталля Цімафееўна.

А 23 мая ў мінскім Доме літаратара ў абласным і гарадскім аддзяленнямі Саюза пісьменнікаў Беларусі сумесна з рэдакцыяй «Вясёлкі» праведзеная вялікая святочная вечарына.

Вясёлка з'яўляецца пасля дажджу, і таму вельмі сімвалічна, што перад пачаткам вечарыны ў Мінску прайшоў буйны лівень, пасля якога сцэна Дома літаратараў расквітнелася незвычайнай творчай «Вясёлкай».

(Працяг на стар. 5)

Звесткі аб дзейнасці Дабрачыннага фонду «Любчанскі замак» за 2010 год

Мінулы год стаў знакавым для Любчанскага замка. Дзякуючы фінансавай дапамозе «Прыорбанка» было выканана больш працаў, чым за ўсе мінулыя гады разам узятыя. Дзве вежы цяпер злучае сцяна, і замак набліжаецца да цэласнага выгляду. Поўнасцю скончаныя ўсе вонкавыя працы на Кутняй вежы і фахверкавай прыбудове, знятае рыштаванне. Акрамя таго, на фахверку зроблены дах, а ўнутры вежы ўстаўленыя ўсе вокны, пачалося высціланне падлогі.

На грунтоўку, фарбаванне ў некалькі слаёў бэлек, сценаў фахверка, памяшканняў флігеля пайшло фарбы столькі, што хапіла б на 3 футбольныя палі.

Увесь першы летнік праводзіліся раскопкі. Знойдзена каля тысячы артэфактаў, якія зараз патрэбна будзе апісаць. Гэтая праца па каштарысе склала 59 млн руб.

З кожным годам праводзіцца ўсё больш летнікаў. У 2010 г. іх было аж чатыры – арганізаваныя Беларускай асацыяцыяй студэнтаў-архітэктараў, Лігай дабрачыннай працы моладзі і самім Дабрачынным фондам «Любчанскі замак». Перад гэтым адбыўся яшчэ і суботнік з фірмай «Caparol», прымеркаваны да Міжнароднага дня помнікаў і гістарычных мясцінаў. Усяго летась у працах прынялі ўдзел 165 валанцёраў, якія добрасумленна працавалі 1 436 дзён.

Пачалася актыўная праца на фасадах ужо другой, Брамнай, вежы. Сёлета мяркуецца ўзвесці часовы будынак, у ім размесцяцца памяшканні для вырабу элементаў крокваў на Брамную вежу і для ўладкавання кузні, без якой немагчыма абысціся пад час рэстаўрацыі.

У адпаведнасці з патрабаваннямі Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 01.06.2005 г. № 302 «Аб некаторых мерах па ўпарадкаванні дзейнасці фондаў», Пастановы Міністэрства юстыцыі ад 03.08.2005 г. № 43 «Аб парадку апублікавання і складзе звестак, што падлягаюць адлюстраванню ў справаздачы па выкарыстанні фондам сваёй маёмасці» просім у якасці дабрачыннай дапамогі апублікаваць звесткі аб дзейнасці Дабрачыннага фонду «Любчанскі замак» па матэрыялах гадавой справаздачы і бухгалтарскага балансу за 2010 год, зацверджаных Кіраўніцтвам і Апякунскай радай фонду.

1. Колькасць заснавальнікаў фонду 1 чал.;
2. Кошт маёмасці (чыстыя актывы) складае 462 724 тыс. рублёў.

У тым ліку:
– маёмасць, перададзеная заснавальнікам і дапамога, аказаная заснавальнікам 18 400 тыс. рублёў;
– паступленні ад праведзеных мерапрыемстваў адсутнічаюць;
– прыбыткі ад прадпрымальніцкай дзейнасці адсутнічаюць;
– грашовыя паступленні 82 907 тыс. рублёў;
– дабрачынная дапамога будаўнічымі матэрыяламі 94 683 тыс. рублёў;
– выкананыя працы на суму 285 133 тыс. рублёў.

3. Расходы (усяго за 8 гадоў дзейнасці фондам было засвоена) 459 893 тыс. рублёў.

4. Унітарныя прадпрыемствы, гаспадарчыя таварыствы не ствараліся і ўдзелу ў дзейнасці такіх юрыдычных асобаў фонд не прымаў.

Справаздача зацверджаная на сумесным сходзе Апякунскай рады і Кіраўніцтва фонду 19.04.2010 г.

Іван ПЯЧЫНСКІ,
дырэктар фонду

Фота Змітра САВЕЛЬЕВА

Рэдакцыя «Краязнаўчай газеты» выказвае шчырыя спачуванні аўтару Леаніду Міхайлавічу Лычу з нагоды смерці жонкі **Ефрасінні Георгіеўны Андрэевай**

Адкрыццё партрэтных галерэяў

З гэтага года дзень 23 мая ўпісаны ў гісторыю мінскага будынка па вул. Фрунзэ, 5, які быў пабудаваны ў 1976 г. для пісьменнікаў па праекце архітэктараў Ю. Грыгор'ева і В. Шубінай і ўпрыгожаны вітражамі і чаканкай В. Стэльмашонка і Ю. Любімава. Менавіта ў гэты дзень у галоўнай актавай зале Дома літаратараў была прэзентаваная і атрымала пастаянную прапіску мастацкая партрэтная галерэя 23 выбітных дзеячаў нацыянальнай культуры – асветнікаў і майстроў высокага слова, сярод каторых Ефрасіння Полацкая, Мікола Гусоўскі, Адам Міцкевіч, Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч, Якуб Колас, Янка Купала, Уладзімір Караткевіч і інш.

Жывапісныя партрэты выкананыя студэнтамі Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў Юрыем Бролем, Юрыем Немагаем, Леанідам Прыходзькам, Віктарам Данільчыкам і Ксеніяй Кудрашовай пад кіраўніцтвам народнага мастака Мая Данцыга і дэкана мастацкага факультэта Уладзіміра Уродніча. Ініцыятарам стварэння партрэтнай галерэі стаў Саюз пісьменнікаў Беларусі. Матэрыяльна падтрымала праект Міністэрства культуры Беларусі. Дыпломнікам было прапанавана зрабіць па пяць жывапісных партрэтаў, і працавалі яны цягам года. Студэнты правялі грунтоўнае даследаванне вядомых партрэтных малюнкаў і фатаграфіяў гэтых асобаў, у пошуку найвялікай выразнасці выяваў вывучалі іх творчыя біяграфіі. Ксенія Кудрашова працавала над вобразамі Францыска Скарыны, Івана Навуменкі і Петруся Броўкі. Віктар Данільчык выканаў партрэты Максіма Багдановіча, Адама Міцкевіча, Янкі Купалы, Міколы Гусоўскага, Аркадзя Куляшова. Вынікі працы экспанаваліся ў галерэі акадэміі. Абарона дыпломных працаў прайшла з удзелам прадстаўнікоў Саюза пісьменнікаў Беларусі і Міністэрства культуры.

Як адзначыў У. Уродніч: «Гэтая праца – вельмі адказная для акадэміі, бо гэтыя асобы засведчылі сябе ў гісторыі, стварылі гонар нашай нацыі. Як сцягі, яны будуць сярод нас».

У прамове на прэзентацыі куратар праекта Май Данцыг падкрэсліў, што ўпершыню ў культурным жыцці краіны студэнты ўзышлі на высокую грамадскую трыбуну з вынікамі сваёй працы і тым самым прынялі ганаровую эстафету грамадскага служэння і патрыятызму ад старэйшых настаўнікаў.

Кіраўнікі праекта ад акадэміі У. Уродніч і М. Данцыг былі ўзнагароджаныя Дыпломамі ад Саюза пісьменнікаў, а выканаўцы партрэтаў за актыўнае і плённае супрацоўніцтва з творчым саюзам і стварэнне галерэі партрэтаў славутых асветнікаў атрымалі ганаровыя Дыпломы Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў.

У гэты ж дзень у фае актавай залы Дома літаратараў адбылася прэзентацыя партрэтнай фота-галерэі дзеячаў беларускай культуры вядомага майстра рэпартажнай фатаграфіі Яўгена Коктыша.

Зм. ВОЖЫК

Міністэрства сувязі Рэспублікі Беларусь

Ф.СП-1

АБАНЕМЕНТ *на газету* 63320 (індэкс выдання)

Краязнаўчая газета

Колькасць камплектаў

на 200_ год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Куды (паштовы індэкс) (адрас)

Каму (прозвішча, ініцыялы)

ПВ | месца | літар

ДАСТАВАЧНАЯ КАРТКА на газету 63320 (індэкс выдання)

Краязнаўчая газета

Кошт: падпіскі _____руб. пераадрасоўкі _____руб. Колькасць камплектаў

на 200_ год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Куды (паштовы індэкс) (адрас)

Каму (прозвішча, ініцыялы)

Погляд з Якуцка

Прадстаўленая нядаўна ў Літаратурным музеі Максіма Багдановіча кніга пацвярджае распаўсюджаны выраз, што лёсы кніг, як і людзей, бываюць розныя, нярэдка – пакручастыя. І застаецца радавацца, што знаходзяцца шчырыя рупліўцы, якія здольныя прадставіць цікавае даследаванне шырокаму колу, а таксама – што «рукапісы не гараць». Гутарка пра кнігу-пошук (так ахарактарызаваў жанр сам аўтар) Івана Ласкова «Летапісная Літва: Сваяцтва і лёс». Нядаўна яна выйшла ў серыі «Неизвестная история», якую стварыў і выдае Анатоль Тарас.

Яшчэ напрыканцы 1980-х гадоў і ў пачатку 1990-х артыкулы, якія ўласна і склалі змест кнігі, друкаваліся ў газеце «Літаратура і мастацтва», часопісе «Полымя». Тэма на той час, калі ішлі спрэчкі пра незалежнасць Беларусі, была цікаваю і запатрабаванаю, а яе высновы для многіх парадаксальныя (узгадайма, што на тыя гады прыпадае з'яўленне ў масавым друку даследаванняў Міколы Ермаловіча пра Старажытную Літву). Аўтар, аналізуючы ў першую чаргу назвы беларускіх рэк, сцвярджаў, што племя літва, якое прыйшло на нашыя землі і дало назву новай дзяржаве, – не славянскае, не балцкае, а уграфінскае, родзіч сучасных пярмянаў ды марыйцаў. Ён даў свае расшыфроўкі назваў рэк і азёраў, якія не тлумачыліся ні з беларускай ды рускай моваў, ні з літоўскай. «Ключ» ён знайшоў у мовах комі, марыйцаў, пермякоў. А карані аўкштайтаў і жамойтаў (продкаў сучасных літоўцаў, якіх дзеля адрознення называе паводле іх саманазвы летувісамі, а краіну Летувой) адшукаў на Дунаі, дзе цячэ рака Олта. Лішне казаць, што такая трактоўка многіх шакавала. І доўгія гады, не ў апошнюю чаргу з-за смерці І. Ласкова, пра ягоныя даследаванні мала хто згадваў.

На прэзентацыю ў музей Багдановіча сабраліся гісторыкі, журналісты, літаратары, а таксама сябры-хімікі, з якімі вучыўся І. Ласкоў у Белдзяржуніверсітэце, пісьменнікі, якія ведалі асабіста Івана Антонавіча. Першым выступіў Анатоль Тарас, які распавёў пра сваё адкрыццё «Летапіснай Літвы» і як узнікла ідэя выдаць яе. Потым пісьменнік і даследчык літаратуры Яўген Лецка распавёў пра асобу Ласкова, спыніўся на расповедзе пра яго жыццё, пра лёс даследаванняў і спробаў іх надрукаваць. Цікавым было выступленне Алеся Баркоўскага, які добра ведаў Ласкова пад час ягонага жыцця ў Якуцку. У яго захоўваецца адзін з асобнікаў машынапісу «Летапіснай Літвы», паводле якога і зробленае новае выданне.

Шмат у новым выданні ілюстрацыяў – карты Беларусі, Комі, Літвы, земляў угра-фінаў і берагоў Дуная; цікавыя таксама фотаздымкі-пары, дзе поруч змешчаныя строі беларусаў і пермякоў, іх дамы, сельгаспрылады і пад., дзе можна пабачыць, што ў многім мы і сапраўды падобныя.

Лявон ПАЛЬСКІ

На фота аўтара: А. Тарас і Я. Лецка пад час прэзентацыі

Наш каляндар

Паэт, пісьменнік, перакладчык, крытык, гісторык Іван Антонавіч ЛАСКОЎ нарадзіўся 19 чэрвеня 1941 года ў Гомелі. Вядомы таксама як аўтар «угра-фінскай» канцэпцыі паходжання беларусаў. Узнагароджаны Ганаровай Граматай Прэзідыума Вярхоўнага Савета Якуцкай АССР. Сябра СП СССР з 1973 года (а таксама – СП ЯАССР і БССР).



Бацька, Антон Іванавіч Ласкавы, украінец-земляроб з Палтаўшчыны, уцёк ад галадамору, ад якога памерла ўся яго сям'я і блізкія (акрамя брата Пятра), у Гомель. У чэрвені 1941 года быў пакліканы ў РСЧА і прапаў без звестак. Ніякіх рэчаў і дакументаў бацькі не захавалася, бо хата ў Гомелі ў вайну згарэла. Маці, Юлія Апанасаўна Казлоўская, нарадзілася ў вёсцы каля станцыі Красны Бераг (цяпер Пухавіцкі раён). Увесну 1942 года перабралася ў вёску Беразякі Краснапольскага раёна, дзе працавала калгасніцай; памерла ў 1963 годзе. Ю. Казлоўская і А. Ласкавы зарэгістраваныя не былі, але Юлія Апанасаўна пісалася Ла́скавай і вымаўляла сваё прозвішча з націскам на першым складзе, што не вельмі падабалася маленькаму Ваню. У пасведчанні аб нараджэнні, выдадзеным у чэрвені 1941 года, ён быў запісаны пад дзявочым прозвішчам маці – «Казлоўскі Іван», з прочыркам у графе «па бацьку», але яно не захавалася. І ён зрабіўся Ласкавым. Калі пайшоў у школу, то русіфікаваў сваё прозвішча ў Ласкоў, а пры атрыманні пашпарта яно замацавалася.

У тры гады ён самастойна навучыўся чытаць, але з прычыны матэрыяльных цяжкасцяў пайшоў у школу толькі ў восем гадоў. Пасля заканчэння 3 класа самастойна здаў іспыты за 4-ы і быў адразу пераведзены ў 5-ы. Яшчэ з Беразякоў, у якіх ён жыў да 1952 года, дасылаў допісы ў піянерскую газету «Зорька», праўда, вершы не друкавалі, але на лісты адказвалі. Выхоўваўся ў Магілёўскім спецыяльным дзіцячым доме № 1, потым у школе № 2, якую скончыў з залатым медалём. Паступіў на хімічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Пры размеркаванні пажадаў паехаць у Дзяржынск Горкаўскай вобласці, дзе працаваў у філіяле Дзяржаўнага навукова-даследчага інстытута прамысловай і санітарнай ачысткі газаў. З 1966 года навучаўся ў Маскве на аддзяленні перакладу ў Літаратурным інстытуце імя А.М. Горкага. Пасля яго заканчэння з чырвоным дыпломам пераехаў у Якуцкую АССР, на радзіму жонкі, якуцкай пісьменніцы Валянціны Мікалаеўны Гаўрыльевай. Працаваў у газеце «Молодёжь Якутии», у Якуцкім кніжным выдавецтве, у часопісе «Полярная звезда». За палемічныя артыкулы пра бацькоў-заснавальнікаў ЯАССР вясной 1993 года быў звольнены з працы і ашальмаваны прадстаўнікамі якуцкай інтэлігенцыі. Падзарабляў выпадковай працай. Апошняе месца працы – у двухмоўным дзіцячым часопісе «Колокольчик»//«Чуораанчык».

29 чэрвеня 1994 года знойдзены мёртвым у прыгарадзе Якуцка па Вілюйскім тракце. Пахаваны на гарадскіх прывілеяваных «Чыраеўскіх могілках». На помніку надпіс: «Ласков Иван Антонович 1942–1994. Писатель. Редактор якутского эпоса «Нюргун Боотур – Стремительный».

Для беларусаў ён – найперш тонкі лірык, паэт і празаік, патрыёт Бацькаўшчыны, аўтар вершаў, паэмаў, апавяданняў, аповесцяў (паэма «Кульга» пра Тамерлана, аповесць «Пішчальнікі не пішчаць» пра Якуцію ў XVII ст., пра сяброўства ды прыгоды ліцвінскага і якуцкага хлопчыкаў, раман «Эпілог» пра лёс засланых у Сібір удзельнікаў паўстання ды інш.).

Паводле бібліяграфічнай даведкі, ласкава прадастаўленай Алесем Баркоўскім

З выданняў краязнаўцаў краіны

Лунінецкія старонкі

Многія часцяком і не задумваюцца, што існуюць іншыя, акрамя «КГ», перыядычныя краязнаўчыя выданні. Плённая праца малавядомых даследчыкаў у шырокіх колах выліваецца ў своеасаблівыя «краязнаўчыя сшыткі». Яны выходзяць, на жаль, даволі малым накладам і распаўсюджваюцца сярод зацікаўленых. Вось чарговы прыклад – выданне творчага клуба «Лунінецкая муза» і Лунінецкага раённага музея па праекце Вадзіма Жылко «Лунінецкі сшытак». Сёлета пабачыў свет яго адзінацаты нумар.

«Лунінецкі сшытак» – выданне краязнаўчых даследаванняў Лунінеччыны. Каштоўнасць яго ў тым, што тут можна пабачыць нідзе раней не друкаваныя гістарычныя звесткі, рэдкія архіўныя фотаздымкі, даведацца імёны сціплых краязнаўцаў-даследчыкаў, якія могуць аказацца нават суседзямі.

У новым нумары размешчаныя вынікі даследавання пра паходжанне назвы вёскі Дзятлавічы, даюцца звесткі пра мясцовую сфрагістыку і пра тое, чым жыла Лунінеччына ў 1921–1935 гады.

Сёння мы прапануем адну з публікацыяў «сшытка». А чытачам застаецца толькі задумацца: ці не існуюць у іх мясцовасці сучасна-рэдкія выданні, якія могуць быць карыснымі кожнаму. А калі няма, то чаму б не стварыць?

Наста КАДЫГРЫБ

Дзятлавічы – ад слова «дзяцелавіна»

Звычайна ў друку, калі ідзе размова аб узнікненні назвы вёскі Дзятлавічы, абавязкова вылучаюць версію, што калісьці там быў вялікі лес і вадзілася шмат дзятлаў. Людзі называлі гэтае месца Дзятлавічамі. Але трэба заўважыць, што ва ўсіх даўніх друкаваных крыніцах мы знаходзім назву Дзяцелавічы. І больш верагодна, што гэтая назва ад слова «дзяцелавіна». Дзяцелавіна (або дзяцеліна) – гэта дзікая белая канюшына, якая сустракаецца паўсюдна на лугах, пустках, лясных палянах, у дварах і ў іншых травяністых месцах. І зараз у Дзятлавічах і ў ваколіцах яе расце шмат. Так што больш падыходзіць версія, што мясціну, а пры пасяленні і вёску, назвалі па наяўнасці вялікай колькасці там белай канюшыны. А назва з цягам часу трансфармавалася з Дзяцелавічы ў Дзятлавічы.

Сцяпан НЕФІДОВІЧ, в. Любань (паводле выдання «Лунінецкі сшытак» – 2011)

Бібліяфільства: традыцыі і працяг

Маючы сур'ёзныя традыцыі беларускага кніжніцтва, мы аказваемся не вельмі спрытнымі перад наступленнем агульнасусветных працэсаў зніжэння чытацкай увагі да друкаванай кнігі. Несумненна, працэсы засваення шматабсяжнай інфармацыі ў электронным выглядзе цалкам адпавядаюць тэндэнцыям у выбары адукацыйных і асветніцкіх праграмаў. Але і на гэтым фоне, на мой прыватны погляд, нельга не разглядаць вартасці эстэтычных, і нават этычных, нормаў паважлівага стаўлення да кнігі і кніжніцтва ўвогуле.

Як адна з формаў захавання прыярытэтаў чытання мне бачыцца пільная ўвага да беларускага бібліяфільскага руху, разгляду яго гісторыі і сучаснага стану. І не абавязкова, разглядаючы запатрабаванасць вырашэння дадзенага пытання, ставіць звышзадачы арганізацыйнага характару. Кніжная справа тады носіць станоўчы характар, калі яе клопаты вырашаюцца надзвычай інтэлігентна, у межах агульнакультурнай прасторы. Калі агучваюцца і рэалізуюцца прыватныя, а разам з тым сутнасна важныя пытанні. Адным з такіх мне падаецца выданне ў Беларусі бібліяфільскага зборніка. Па-першае, нягледзячы на розныя (найперш навуковыя, радзей – навукова-папулярныя ці папулярныя) спробы раскрыць гісторыю кніжніцтва на тэрыторыі нашай краіны, комплекснае вырашэнне задачы так яшчэ і не выкананае. Зроблена шмат, але ёсць яшчэ над чым працаваць. Асобныя праекты навуковых падыходаў у гэтым накірунку (у першую чаргу – гісторыкамі кнігі, якія працуюць у вядучых бібліятэках Беларусі, а таксама беларускімі энцыклапедыстамі, якія першым томам «Гісторыі беларускай кнігі» прадэкларавалі сапраўдны прасцяг у кнігазнаўчай працы) паспяхова рэалізоўваюцца. Але ж патрэбная шырокая атмасфера, якую будуць насычаць і бібліятэкары-практыкі, і бібліятэказнаўцы, і гісторыкі, і архівісты, і нават проста збіральнікі кніг. Па-другое, патрэбу бібліяфільскага зборніка абумоўлівае яшчэ і важнасць выкладання разнастайнага матэрыялу даступнай, папулярнай мовай у зручным фармаце.



Бібліяфіл і калекцыянер Барыс Пятроўскі

Такі кніжны праект ужо існуе, абмяркоўваецца і з'яўляецца блізкім да ажыццяўлення. Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Літаратура і Мастацтва», якая аб'яднала ў сваім складзе літаратурна-мастацкую перыёдыку – газету «Літаратура і мастацтва», часопісы «Полымя», «Маладосць», «Нёман», «Бярозка», альманах «Вожык», выступае з канкрэтнай ініцыятывай выдання ў Беларусі «Альманаха бібліяфіла». Знаныя кніжнікі адразу згадаюць два праекты: «Альманах бібліяфіла», які выходзіў у 1970–1980-я ў маскоўскім выдавецтве «Книга» (першы выпуск быў зроблены ў 1973 годзе), і зборнік «Свіцязь. Свитязь», які выйшаў ў мінскім выдавецтве «Беларусь» ў 1989 годзе. Можна згадаць яшчэ і ленінградскі «Альманах бібліяфіла» 1929 года, які быў яшчэ і факсімільна перавыдадзены.

Выкладаючы дадзеную праграму, хацеў бы заўважыць, што яна ўяўляе сабою праект-заклік, які, спадзяюся, будзе пачуты. Яго фармат адкрыты і разлічаны на вашае, паважанае спадарства, абмеркаванне, вашыя заўвагі і падказкі. Вялікія спадзяванні мы ўскладаем на навукова-практычны досвед супрацоўнікаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, Нацыянальнай кніжнай палаты Беларусі, Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа НАН Беларусі

Традыцыя выдання альманахаў у Беларусі досыць даўняя. І тое, што зараз ў нас зарэгістраваны толькі адзін перыядычны альманах «Вожык», ніяк не адлюстроўвае даўнюю і блізкую гісторыю. Варта ўспомніць альманахі кніжнага характару, што выходзілі ў 1980–1990-х гадах: перакладной літаратуры – «Далягляды», «Братэрства» (выдавецтва «Мастацкая літаратура»), «Ветразь» («Юнацтва»), крытыкі – «Вобраз», публіцыстыкі – «Сучаснік», гісторыі і краязнаўства – «Шляхам гадоў». Шкада, што гэтыя кніжныя ініцыятывы зараз сыйшлі ў нікуды. Хаця па-ранейшаму не знікла прастора перакладаў мастацкай літаратуры на беларускую мову. Існуе патрэба ў адраджэнні беларускага мастацкага нарыса. Нямала праблемаў існуе з выданнем літаратурна-мастацкай крытыкі: колькасць кніг у гэтай тэматычнай прасторы шматкроць зменшылася. І якраз альманах, напрыклад, «Вобраз», мог бы стаць для спецыялістаў дадзенай галіны добрай пляцоўкай для вырашэння шэрагу праблемаў, раскрыцця некаторых тэмаў, якія патрабуюць аператыўнага ўмяшальніцтва крытыкі.



Экслібрыс Вацлава Ластоўскага

Якім мы збіраемся зрабіць беларускі «Альманах бібліяфіла»? Што павінна стаць асновай яго зместу? Якія праблемна-тэматычныя накірункі нас як выдаўцоў цікавяць у кантэксце працы над мяркуемым зборнікам? Аналізуючы вопыт папярэднікаў у Расіі і Беларусі, асабліва ўважліва аглядаючы змест ленінградскага «Альманаха бібліяфіла» 1929 года, мы скіроўваем увагу да наступных тэматычных плыняў: гісторыя, тэорыя, тэхніка кніжнага мастацтва; кнігазбіральніцтва (праблемы і вопыт фарміравання прыватных і грамадскіх кнігазбораў); бібліяфілы (мяркую, што гэты раздзел павінен быць ці не самым насычаным ужо з-за таго, што наспела патрэба аддаць даніну павагі тым людзям, для якіх кніга была галоўнай каштоўнасцю. Асаблівай увагі патрабуе параўнальна блізкая гісторыя 1940–1980-х. Шмат якія імёны не ўведзеныя ў кантэкст гісторыі кнігі ў Беларусі і застаюцца вядомымі толькі ў вузкіх асяродках кніжнікаў); кніжны гандаль (кнігарні Мінска і іншых гарадоў, пачатак мінулага стагоддзя, беларускія кнігарні Вільні і Заходняй Беларусі); ілюстраванне кнігі, праца гравёраў і літографаў; дзяржаўныя і прыватныя кнігасховішчы (вытокі фармавання абласных бібліятэк у Гродне, Мінску, Брэсце і інш. гарадах краіны); гісторыя асобных кніг; мастацкія творы пра кнігу; беларуская кніга ў свеце; бібліяфільская хроніка асноўных кніжных падзеяў у сучаснай Беларусі.

Выкладаючы дадзеную праграму, хацеў бы заўважыць, што яна ўяўляе сабою праект-заклік, які, спадзяюся, будзе пачуты. Яго фармат адкрыты і разлічаны на вашае, паважанае спадарства, абмеркаванне, вашыя заўвагі і падказкі. Вялікія спадзяванні мы ўскладаем на навукова-практычны досвед супрацоўнікаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, Нацыянальнай кніжнай палаты Беларусі, Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа НАН Беларусі.

Язэп Гладкі



У рэдакцыі часопіса «Наш край» (злева направа): Уладзімір Дубоўка, Змітрок Бядуля, Мікола Каспяровіч

А што да магчымых аўтараў новага выдання, то мне здаецца, артыкулаў павінна сабрацца столькі, што за першым выпускам выдаўцам давядзецца рабіць і другі. Варта запрасіць да ўдзелу ў праекце і даследчыкаў славянскай кнігі. Беларускае кніжніцтва – у полі зроку і ўкраінскіх, і расійскіх, і польскіх, і літоўскіх вучоных, бібліятэказнаўцаў, аматараў кнігазбіральніцтва. Можна меркаваць аб гэтым і па нядаўна выдадзенай энцыклапедыі Яўгена Неміроўскага «Іван Фёдараў і яго эпоха» (Масква, 2010). Многія старонкі гэтага сапраўды шматабсяжнага выдання пра Беларусь і беларускую кнігу.

Аўтарамі і героямі альманаха ў першую чаргу маглі б стаць гаспадары сучасных прыватных кнігазбораў. Вельмі мала расказваецца сёння пра іх захапленне кнігай у перыядычным друку. А некалі ж тэматыка такога кшталту была прыярытэтнай. Час ад часу журналісты мясцовага друку, гарадскіх газет выяўлялі такіх людзей. Сёння як быццам пустыня... Але гэта не так, бо па-ранейшаму ёсць і збіральнікі, па-ранейшаму папаўняюцца бібліяфільскія шэрагі за кошт моладзі. Мо не так інтэнсіўна, як раней, і ўсё ж... Варта сур'ёзную ўвагу звярнуць на пісьменніцкія кнігазборы. Ведаю, што сур'ёзныя, цікавыя бібліятэкі маюць Алесь Марціновіч, Алесь Бадак, муж і жонка Віктар Шніп і Людміла Рублеўская, Віктар Рабкоў... А хто раскажа пра бібліятэкі Адама Мальдзіса, Івана Саламевіча? Многія літаратары альбо іх спадчыннікі перадаюць свае прыватныя бібліятэкі ў грамадскія. Так, напрыклад, зрабіў у свой час Аляксандр Капусцін, аддаўшы многія свае кнігі ў адну са школ роднага Жлобіна. У Пухавіцкі раённы краязнаўчы музей перадаў частку кніг з бацькавай бібліятэкі сын паэта Алеся Бачылы – кандыдат тэхнічных навук Барыс Бачыла. І пра гэта таксама варта расказваць, апісваючы тыя дарункі.

Алесь КАРЛЮКЕВІЧ

Юбілей добрага казачніка са Случчыны

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 1)

Участаўай зале сабраліся супрацоўнікі рэдакцыі часопіса на чале з галоўным рэдактарам Уладзімірам Ліпскім, сябры Васіля Віткі і «Вясёлкі», яго землякі, вядомыя творчыя дзеячы, маленькія чытачы і прыхільнікі творцы.

Адкрываючы вечарыну, Уладзімір Сцяпанавіч нагадаў пра незвычайны жыццёвы шлях юбіляра, які з вясковага пастушка стаў класікам дзіцячай літаратуры, узышоў на алімп лаўрэата Дзяржаўнай прэміі БССР, заслужанага дзеяча культуры і стварыў «Вясёлку» – крыніцу новай літаратуры для маленькага чытача. Сямнаццаць гадоў Васіль Вітка люляў яе і перадаў сваім наступнікам. За вясёлкаўскія 54 гады ў ёй шчыравалі вядомыя беларускія пісьменнікі – Сяргей Грахоўскі, Алесь Пальчэўскі, Артур Вольскі, Еўдакія Лось, Анатоль Грачанікаў, Уладзімір Ліпскі, Мікола Маляўка, Казімір Камейша, Мікола Чарняўскі ды іншыя.

Пасля ўступнага слова У. Ліпскі запрасіў на сцэну артыстаў дзіцячага садка «Ліхтарык», якія прачыталі вершы і праспявалі песні на словы Васіля Віткі.

Потым ўзяла слова выхаванка купалаўскай сям'і і Васіля Віткі Тамара Тарасава. Напачатку яна прачытала два вершы юбіляра, потым падзялілася ўспамінамі, нагадала пра знаёмства з Цімохам Васільевічам. Як расказала Тамара Сяргееўна: «Яно адбылося пад час прэм'еры яго другой п'есы "Янка Купала" ў Купалаўскім тэатры. Цімох Васільевіч цёпла павітаўся з Нінай Раманоўскай і мне падаў руку. Тады я атрымала першы ўрок паводзін – этыкету. Калі я яшчэ была студэнткай, мяне запрасіла цёця Уладзя на практыку ў Купалаўскі музей. Пасля заканчэння вучобы прынялі туды на працу. З музея Цімох Васільевіч запрасіў мяне ў "Вясёлку", якой я аддала больш за 30 гадоў жыцця. Я вельмі ўдзячна яму, ён шмат чаму навучыў мяне. Гэта быў незвычайны чалавек. З чатырма класамі пачатковай школы і ПТВ ён змог дасягнуць такіх вышынь і стаць надзвычай адукаваным чалавекам.

Я была сведкай, як ён адказна працаваў над кожным словам. Яго хочацца чытать таму, што адчуваеш асалоду ад кожнага яго роднага беларускага слова. Мне даводзілася часта выступаць з ім і я бачыла, як дзеці цягнуцца да яго, як ён умеў разумець дзяцей. Ён размаўляў з імі, як з дарослымі, але моваю дзяцей. Ён праводзіў на тэлебачанні ўрокі роднага слова і ўрокі казкі, ствараў скорагаворкі і загадкі. Умеў так з дзецьмі гаварыць, што яны самі пачыналі складаць казкі, вершы і загадкі.

М. Чарняўскі

Чалавек даволі закрыты, не перад кожным ён мог адкрыць сваю душу. У яго было некалькі вельмі блізкіх, дарагіх яму сяброў. Гэта Янка Брыль, Мікола Лобан, Алесь Бачыла. Кожны вечар яны хадзілі на прагулкі ў скверык, кажучы: "Мы ідзем да Купалы".

У вольны час любіў паслухаць класічную і народную музыку, якую добра і глыбока разумеў. Яго любімымі творамі былі Саракавая сімфонія Моцарта і "Апасіянната" Бетховена. Музыка яму вельмі дапамагала ў творчасці і ў жыцці».

Напрыканцы Тамара Сяргееўна прачытала верш Васіля Віткі «Сосны».

Потым нечакана для ўсіх пазабавіў прысутных Пацук са спектакля «Брык і Шуся», які прачытаў жартоўныя вершы класіка. Ганна Атрошчанка (нашая шаноўная аўтарка. – **«КГ»**) праспявала «Зязюльку», а заслужаны артыст Беларусі Іван Краснадубскі выканаў песню «Бацькоўская хата».

Дырэктар Слуцкай раённай бібліятэкі Людміла Маліноўская нагадала словы Васіля Віткі: «Без памяці, без жывых вытокаў не можа быць духоўна багатага чалавека...» і расказала пра сёлетнія ўрачыстасці на яго радзіме. Яна адзначыла, што ўсе гэтыя мерапрыемствы немагчыма было б здзейсніць без вясёлкаўцаў, і ў знак падзякі перадала ў музей «Вясёлкі» вышыты настаўніцай ручнік. Сапраўдным сюрпрызам для ўдзельнікаў вечарыны стала выступленне вучаніцы Слуцкай музычнай школы Аляксандры Ермаковай з прэм'ерай песні «Ён упрыгожыў гэты свет». Песня напісаная менавіта да 100-годдзя пісьменніка паэтам Міколам Маляўкам і народным артыстам Беларусі кампазітарам Эдуардам Зарыцкім.

Мікола Маляўка адзначыў, што творчая спадчына Віткі можа скласці гонар для любой краіны, любой літаратуры, любога народа. Але акрамя апавяданняў, вершаў, п'есаў, паэмаў ён пакінуў нам урокі душы, урокі думкі, урокі любові да роднага краю, урокі роднага слова.

Дырэктар бібліятэкі імя Васіля Віткі Тамара Патук расказала пра рознабаковую дзейнасць сваёй установы, адзін з напрамкаў працы якой – прапаганда беларускай дзіцячай літаратуры, культуры, традыцыяў і абрадаў. Яна паведаміла пра сяброўства і супрацоўніцтва з рэдакцыяй «Вясёлкі» (якому ўжо больш за 10 гадоў) і стварэнне ў бібліятэцы філіяла музея часопіса, дзе з 16 мая ўжо праводзяцца экскурсіі, а таксама выказала асаблівую падзяку Тамары Тарасавай за дапамогу ў стварэнні музея і запрасіла яго наведаць.

Успомніў пра свае сустрэчы з класікам і лаўрэат прэміі Васіля Віткі Мікола Чарняўскі. Першая яго сустрэча з Віткам адбылася

Міхась Пазнякоў адзначыў, што за гады працы ў «Вясёлцы» Васіль Вітка выхаваў плеяду дзіцячых пісьменнікаў. Дзякуючы яму беларускую дзіцячую літаратуру ведаюць у многіх краінах свету. Нагадаў паэт пра свае асабістыя сустрэчы з Віткам і ўражанні ад яго асобы: «Гэта быў далікатны, інтэлігентны, вельмі адукаваны чалавек. Яго парады былі ўзорам служэння роднаму слову і Беларусі».

7 верасня 1960 года ў мінскай цэнтральнай кнігарні, дзе сабраліся на прэзентацыю сваіх твораў беларускія пісьменнікі. Тады Вітка падпісаў маладому паэту сваю кнігу «Ружа і штык». Дарэчы, гэтую кнігу, а таксама кнігу «Вернасць», падпісаную ў кастрычніку 1960 года, Мікола Чарняўскі перадаў у бібліятэчны філіял музея «Вясёлкі». Ён нагадаў цікавы факт: калі ён яшчэ вучнем атрымаў ад «Вясёлкі» свой першы ганарар ажно 400 рублёў, на іх купіў сабе выпускны касцюм і булачку са смажанаю траской, смак якой запомніў на ўсё жыццё. Мікола Чарняўскі прапанаваў усталяваць на доме па мінскай вуліцы К. Маркса, 36, дзе жыў Цімох Васільевіч, мемарыяльную дошку.

Землякі юбіляра – дырэктары слуцкіх школ Ніна Харошка (Акцябрская базавая агульнаадукацыйная) і Мікалай Хілько (політэхнічная № 3) паведамілі пра створаныя ў школьных музеях экспазіцыі, прысвечаныя Вітку. Сярод экспанатаў падпісаныя ім кнігі, рукапісы вершаў, асабістыя рэчы, перададзеныя яго дзецьмі Наталляй і Вісарыёнам. Вучні не толькі праводзяць экскурсіі, але і даглядаюць магілы бацькоў класіка, дапамагаюць яго сястры. Словы Віткі пад гербам Случчыны «Ёсць на зямлі такі куток, // З якім навек я злучаны, // Адкуль ступіў свой першы крок – // Мая радзіма Случчына...» у школьным музеі натхняюць вучняў на літаратурную творчасць, абуджаюць таленты. І таму невыпадкова адзін з выхаванцаў політэхнічнай школы напісаў такі верш:

«У Слуцку ўсё
па-людску», –
Пісаў паэт-зямляк,
І ім я ганаруся.
Я малады слуцак.

Я ганаруся шчыра
Радзімаю малой.
Мой горад старажытны
Заўжды ў душы маёй.

А ўдзельнікі вечарыны гарачымі апладысментамі дзякавалі за цікавыя выступленні маленькім артыстам: дзіцячай эстраднай студыі «Аванці» і дзяўчынцы з вокладкі «Вясёлкі» – «Міс "Вясёлцы"» Анастасіі Асмалоўскай.

Напрыканцы У. Ліпскі расказаў пра сёлетнія дасягненні і планы «Вясёлкі». Адкрыты сайт часопіса, які за два месяцы наведала 5 тысячаў чытачоў і які на конкурсе «Цібо-2011» адзначаны крыштальлёвай вазай і дыпломам. Падрыхтаваныя пяць кніжак выбраных зборнікаў-падручнікаў для дзяцей, якія разышліся імгненна. Кніжкі так і называюца – «Вясёлка». Рыхтуецца шосты, які будзе прысвечаны Вітку і выйдзе ў наступным годзе да 55-га юбілею «Вясёлкі». Накладам 12 тысячаў асобнікаў выйшла кніга па Радзімазнаўстве пра Гарадзейшчыну, асобнік якой атрымаў кожны выпускнік пачатковых школ вобласці. Рыхтуецца такое выданне па Гомельшчыне. Напярадзе шмат цікавых ідэяў і праектаў.

Завяршылася свята любімай песняй Цімоха Васільевіча «Радзіма мая дарагая», якая стала сапраўдным гімнам роднай Беларусі і прагучала ў гонар яго памяці.

С. АЛАВЕЙКА

Для экскурсаводаў, і не толькі

Уладары Пастаўскіх маёнткаў

Працяг. Пачатак у № 22

Радзівілы

Род Радзівілаў – адзін з найбольш вядомых, багатых і ўплывовых родаў на Беларусі. Яго прадстаўнікі валодалі вялікімі абшарамі, шматлікімі мястэчкамі і вёскамі. Галоўнай рэзідэнцыяй роду быў Нясвіж.

У 1628 годзе Ганна Сафія Зяновіч выйшла замуж за Альбрэхта Уладзіслава Радзівіла (1589–1636), і Паставы перайшлі ў валоданне гэтага роду. Гэта быў другі шлюб Альбрэхта Уладзіслава. Першай яго жонкай была дачка вялікага канцлера літоўскага Льва Сапегі Ганна, з якой ён пабраўся шлюбам у 1617 годзе. У сям'і нарадзілася трое дзяцей, але ўсе яны рана памерлі. Рана памерла і першая жонка (1627).

У шлюбе з Ганнай Сафіяй Зяновіч было чацвёра дзяцей. Двое з іх памерлі яшчэ ў дзяцінстве, а дочкі Альжбета Анастасія і Калумба Канстанцыя Сафія сталі манашкамі, прычым апошняя адмовілася выходзіць замуж за Яна Сабескага і ўступіла ў Віленскі кляштар кармелітак.

Альбрэхт Уладзіслаў атрымаў добрую адукацыю ў езуіцкіх калегіумах Нясвіжа, Бранава (Польшча) і Аўгсбурга (Германія). Для яе завяршэння падарожнічаў разам з братамі па Італіі. Рыхтавалі яго да ваеннай дзейнасці, і таму ён рана пачаў ваенную кар'еру. На чале сваіх атрадаў удзельнічаў у вайне Рэчы Паспалітай і Швецыі (1600–1629), а таксама ў вайне з Ра-сіяй (1609–1618). Прымаў удзел у асадзе Пскова-Пячорскага манастыра (1611) і ў паходах 1611–1612 гадоў на Маскву. Калі вярнуўся на радзіму, быў паслом на сеймах 1613 і 1615 га-доў, займаў пасады старасты рыжскага (1614–1620), столь-ніка ВКЛ (1620), крайчага ВКЛ (1622) і кашталяна трокскага (1626), прымаў удзел у выбранні на польскі трон караля Уладзіслава IV. У 1633 годзе стаў кашталянам вілен-скім. Альбрэхт Уладзіслаў утрымліваў пры сваім двары мастакоў, якія пісалі партрэты Радзівілаў і іх сваякоў. Некаторыя даследчыкі менавіта яго лічаць стваральнікам знака-мітай нясвіжскай галерэі.

З нагоды пераходу Паставаў ва ўладанне Радзівілаў быў складзены інвентар маёнтка, у якім апісваецца тое багацце, якое атрымаў новы гаспадар. Так, акрамя будынкаў двара і фальварка, кароваў і быкоў было 13 галоваў, авечак – 17, свіней – 16, гусей – 12, курэй – 10. У тым жа інвентары даецца апісанне мястэчка: «Спачатку драўляны касцёл з усім прыналежным начыннем і плябанія каля яго, карчма з белай ізбой і пякарняй, драніцамі ашаляваная, на вуліцы, што ідзе да Зарэчча, царква пад тытулам святога Мікалая з усім начыннем». На гандлёвай плошчы знаходзіліся шэсць дваро ў гандляроў і рамеснікаў, на вуліцах-дарогах, што вялі на Мядзел, Друю і Глыбокае, было 26 двароў, на Зарэччы месцілася 17 двароў. Былі таксама два пасады на 8 і 9 двароў. У дакуменце называюцца прозвішчы мяшчанаў, якія жылі на рынку, на розных вуліцах і на Зарэччы. Сярод іх часцей называюцца: Бржазінскі, Адамовіч, Шчакатовіч, Сапрановіч, Лукашэвіч, Рамановіч, Залескі, Лагвіновіч, Цыган, Паўловіч, Хватовіч, Шымковіч, Тамашэвіч, Валянцэвіч, Фатовіч, Кабылянін, Казелка, Ваўковіч, Нікіпаровіч, Жыдковіч, Кравец. Цікава, што 29 гаспадароў павінныя былі плаціць капшчыну за тое, што займаліся вырабам піва і гарэлкі. Паводле інвентару, у мястэчку на той час быў млын і карчма. Як важныя прыбытковыя аб'екты ў дакуменце называюцца азёры (Доўж каля Дружкаў, Шылава каля мястэчка Паставы на Марыку, Паставы, Брак, Кішчайка, Анцікудава, Тудзбо, Беразоўка, Лапухова каля Рэбекаў) і рэкі (Мядзеліца, партовая, па якой ходзяць суднысаткамі да Дзісны і з Дзісны; Лучайка, Дзявіца, Дукавіца). Згадваюцца таксама «пушчы, лясы і бары немалыя...; гэтай пушчы працягласць мае быць на міль пяць або шэсць».

Альбрэхт Уладзіслаў Радзівіл

Бяганскія

Значна змяніліся Паставы ў часы гаспадарання Яраша і Станіслава Бяганскіх. Радавод Бяганскіх бярэ пачатак з Мазовіі, у Вялікае Княства прадстаўнікі гэтага роду перасяліліся ў сярэдзіне XVI стагоддзя. Мелі герб «Праўдзіч» – на блакітным фоне выява льва з жалезным колам у лапах. У XVII–XVIII стагоддзях займалі высокія адміністрацыйныя пасады ў дзяржаве. Мелі шмат маёнткаў, асабліва ў Ашмянскім павеце (Паставы, Полава, Чарняцічы). У 1616 годзе каралеўскі сакратар Станіслаў Бяганскі з жонкай Ганнай з Сянкевічаў фундаваў будаўніцтва ў Паставах касцёла і кляштара францысканцаў. Для гэтага ён выкупіў у суседзяў зямлю на Востраве-Гарадзішчы, утвораным выгінам ракі Мядзелкі і каналам (зараз там стаіць касцёл), атрымаў дазвол на будоўлю на з'ездзе ў Львове.

Толькі ў 1624 годзе пачалося аб'яднанне маёнткаў у адных руках, якое цягнулася аж да канца стагоддзя, і апынуліся гэтыя землі зноў пад уладай Зяновічаў.

Ежы (Юрый) Ян Зяновіч, віленскі земскі суддзя, уласнік мястэчка і шматлікіх фальваркаў, у шлюбе з Канстанцыяй Сыруцянкай меў дзвюх дачок: Сафію, якая выйшла замуж за Ежы Кельпша, і Апалонію, якую ўзяў у жонкі каралеўскі сакратар граф Казімір Бяганскі. Пры падзеле маёмасці паміж сёстрамі Паставы, Востраў і Судэрва дасталіся ў 1686 годзе Апалоніі Бяганскай.

Вядома, што Казімір Бяганскі ўдзельнічаў у выступленні супраць Сапегаў. Быў пахаваны разам з жонкай у склепе францысканскага храма ў Паставах. Захавалася надмагільная пліта з надпісам: «Тут спачываюць целы гаспод вяльможных г.г. Казіміра і Апалоніі з Дэспатаў Зяновічаў з Бяганава Бяганскіх маршалкаў Браслаўскіх супругаў фундатараў гэтага касцёла і іх нашчадкаў, пахаваных...» (далей тэкст не чытаецца).

Пазней Паставамі валодаў сын К.У. Бяганскага старадубскі староста Ян Казімір Бяганскі з жонкай Аляксандрай з Крышпінаў. Факты біяграфіі гавораць пра тое, што чалавек гэты быў даволі авантурны і рызыкоўны: у 1710 годзе займаў пасаду маршалка Трыбунала ВКЛ, а ў 1718 годзе на сойме ў Гародні быў абвінавачаны ў фальсіфікацыях каралеўскіх дакументаў, прыгавораны да пакарання смерцю. Пазбег трагічнага канца, схаваўшыся ў Гарадзенскім кляштары кармелітаў. Пазней зноў вярнуўся да палітычнай дзейнасці. Меў сына і дачку Ганну. Сватаючы сваю дачку за пісара ВКЛ Бенядзікта Тызенгаўза, абяцаў даць 100000 злотых пасагу, аднак напярэдадні вяселля паехаў да бацькі маладога і прапанаваў замест грошай маёнтак Паставы. Замена, відаць, была не роўная, бо Тызенгаўзы палічылі сябе пакрыўджанымі, і справа дайшла да суда. Як бы там ні было, але ў 1722 годзе мястэчка пераходзіць да Бенядзікта Тызенгаўза, які атрымаў яго, ажаніўшыся з Ганнай – дачкой Бяганскіх. З гэтага часу і амаль да сярэдзіны XX стагоддзя Паставы знаходзіліся ва ўладанні баронскага роду Тызенгаўзаў герба «Bawol», нашчадкаў крыжакоў.

Ігар ПРАКАПОВІЧ

(Працяг будзе)

Першыя дні акупацыі Слуцка

Фота з архіва Слуцкага краязнаўчага музея

Жыццёвыя гісторыі

Яго на Случчыне ў 1930–1960-я гады ведала і паважала не толькі моладзь, але і старажыхары – за высокае майстэрства музыканта. Бадай, трэць вёсак у раёне запрашала Яна Данілавіча на вечарынку ці на вяселле. І ён не адмаўляў. Пад яго баян танчылі нават вясковыя бабулі. А баян ён пазней, у 1940-я, меў самы дасканалы – падарунак за ўдзел у нейкім абласным конкурсе баяністаў.

Мне давялося сустракацца з ім не толькі ў сваёй вёсцы на вечарынках, але і дома, у яго лясной вёсцы Круглае, што за чатыры кіламетры ад шашы-«варшаўкі» ў бок мястэчка Урэчча. Ян Данілавіч быў цікавым суразмоўцам, які аднойчы паведаміў гісторыю свайго навагодняга палону на паліцэйскім блок-посце пасёлка Кучына 31 снежня 1943 года.

Пад вечар каля яго хаты, што стаяла другой на краі вёскі, пад'ехала санная павозка, з яе сышлі двое з вінтоўкамі і пагрукалі ў дзверы. Ян Данілавіч падумаў, што гэта партызаны, бо яны часцяком наведваліся ў яго вёску, звычайна ноччу. А ў хату зайшлі салдаты з размешчанага каля пасёлка блок-посту. У шэрых шынялях з нарукаўнай нашыўкай «РОА» – «Русская освободительная армия», якую ў 1943 годзе стварыў небезвядомы палонны генерал Уласаў. Былі яны маладыя, адразу назвалі мэту свайго візіту. Ім стала вядома ад жыхароў пасёлка, што Ян Данілавіч выдатны баяніст, таму: «Приглашаем вас на блок-пост сыграть нашим ребятам что-нибудь под Новый год. Назад привезём чин-чином». Ён пачаў ім тлумачыць, што за такую паездку партызаны, калі хто данясе ім, расстраляюць яго як варожы элемент. І жонка падзяліла трывогу мужа, але госці адступаць і не думалі, што адчувалася па тоне іх размовы. Запэўнівалі, што прывязуць ноччу, калі вёска будзе спаць, ніхто нічога не пачуе.

Праз нейкую паўгадзіну язды сані спыніліся каля ўвахода ў блок-пост. Вартавы з ручным кулямётам на брустверы прапусціў іх у даволі прасторную зямлянку, дзе за доўгім сталом пры святле газнічкі сядзела чалавек восем вайскоўцаў у шэрых мундзірах з ужо знаёмымі нарукаўнымі нашыўкамі. На стале праглядваліся бутэлькі спіртнога, горкі нарэзанага хлеба, закуска. Запрасілі і Яна Данілавіча да стала, далі выпіць і закусіць, самі не раз прыкладваліся да алюмініевых кубачкаў. А калі захмялелі, загадалі граць мелодыі даваенных савецкіх песняў – «Катюша», «Три танкиста», «Раскинулось море широко», такіх знаёмых Яну Данілавічу. Салдаты дружна падпявалі хорам, на вачах двух, што сядзелі паблізу баяніста, набеглі слёзы. З адным з іх Ян Данілавіч потым выйшаў у калідорчык пакурыць, дастаў свой капшук з самасадам, салдат – нямецкія цыгарэты. Ён падзяліўся тайнай свайго прыходу ў гэтае войска. Трапіў у палон з тысячамі іншых чырвонаармейцаў восенню 1941-га пад Бранскам, дзе ў акружэнні апынулася цэлая армія. Разам з сотнямі ваеннапалонных прыгналі ў Бабруйск, у лагер, дзе яны паміралі ад голаду і хваробаў, за ноч з барака выносілі дзясяткі трупаў. Недзе ў студзені 1943-га ў лагер завітаў прадстаўнік ад той арміі Уласава, стаў агітаваць за ўступленне ў яе шэрагі. І салдат даў згоду – падумаў, што ачомаецца там і ўцячэ да партызанаў. Хацелася жыць, яму было толькі дваццаць два гады. І вось апынуўся тут, на блок-посце. Нядаўна пачуў, што адзін з іх падаўся да партызанаў, але яго там расстралялі. Цяпер боязна ісці ў лес.

За паўноч на той жа саннай павозцы адзін з тых двух, што прывезлі яго на блок-пост, адвёз Яна Данілавіча дамоў, перадаў бляшанку тушонкі і бохан хлеба.

Летам 1944 года з тым уласаўцам, што прывёз яго назад дамоў, Ян Данілавіч сустрэўся зноў – ужо калі той быў партызанам нейкай любанскай брыгады. Той завітаў у хату, і яны распілі бутэльку добрай хлебнай самагонкі, а на развітанне Ян Данілавіч сыграў яму мелодыю песні «Тры танкісты».

...Цяпер у вёсцы Круглае жывуць толькі сем пенсіянераў, каму за семдзясят. За аселіцай на могілках помнік Яну Данілавічу стаіць побач з магілай яго жонкі Лізаветы Міхайлаўны, якая на пятнаццаць гадоў перажыла мужа. У іх не было дзяцей, і яна пры жыцці заказала сабе помнік, які і паставілі пасля смерці суседзі.

Міхаіл ТЫЧЫНА

Традыцыі і сучаснасць

Рэальны росквіт бардаўскага руху

«Бібліятэка Свабоды XXI ст.» – «Сто бардаў Свабоды», Praha, 2011, «RFE/RL»

Нядаўна, даючы інтэрв'ю, я дадумаўся да парадаксальных нават для сябе высноваў наконт развіцця беларускай бардаўскай песні: маўляў, хоць росквіт гэтага жанру ў Беларусі прыпадае на 1980-я гады, калі квітнелі імёны такіх зорак, як Сяржук Сокалаў-Воюш, Вальжына Цярэшчанка, Віктар Шалкевіч, Алесь Камоцкі, але шанц рэальнага жыцця жанр атрымаў толькі цяпер, калі адбываюцца канцэрты ў найсамрэч прэстыжных залах, маштабныя фэсты, выдаюцца аўтарскія альбомы старых і новых зорак-бардаў, рыхтуюцца мультымедыйныя і аўдыёскладанкі. І акурат у тыя дні, нібы пацверджаннем маіх словаў, выходзіць чарговая мультымедыйная складанка «Сто бардаў Свабоды».

Стаўлю новы дыск на плэер і мімаволі прыгадваю біблейскую ісціну: кожная рэч мае прынамсі два значэнні. У гэтым выпадку таму, што тут цяжка нават скеміць – дабро нясе цывілізацыя чалавецтву ці зло. Калі ў 1980-я барды зусім не мелі ніякіх дыскаў, а фэны мелі хіба толькі самаробныя магнітазапісы, затое новыя творы куміраў ведаў кожны, дык у час інфармацыйных тэхналогіяў адзін дыск цяпер можа змясціць аж 100 бардаў, плюс 100 інтэрв'ю з імі, фоткі ды ажно паўтысячы песень (абы DVD працаваў). А галованька не апухне, калі праслухаеш усё гэта?



Не ведаю, як моладзь, а мне ў асэнсаванні надта ж дапамог ранейшы досвед, бо ініцыятары праекта ўключылі ў яго не толькі раскручаныя хіты новых зорак, але й новыя песні старых. Тыя ж Лявон Вольскі або Зміцер Вайцюшкевіч, безумоўна, прыцягнуць да сябе ўвагу, бо неяк упісаліся ў шоўбізнес ; а ёсць жа і не ўпісаныя ТАЛЕНТЫ. Ну няўжо пакаленне 1990-х пройдзе міма такіх імёнаў, як Ален (Сяржук Хамякоў), Кастусь Герашчанка, Анатоль Кудласевіч, Алег Мізула? А легенды з беларусаў замежжа – Ілона Карпюк, Тамаш Суліма, Алег Кабзар? Ёсць тут і сучасныя ўлюбёнцы: Тацяна Белаюгая, Андрэй Мельнікаў, Яраш Малішэўскі, Алесь Наркевіч, Сяржук Патаранскі, Алесь Лось. Не абыйшлося на новым дыску і без старога рок-н-рольшчыка Андрэя Плясанава, без ягоных калегаў па сцэне – Змітра Сідаровіча, Уладзі Круміна, Аляксандра Памідорава. Ну і мега-зоркі жанру не маглі не засвяціцца зноў: Сяржук Сокалаў-Воюш, Вольга Цярэшчанка, Алесь і Кася Камоцкія, Віктар Шалкевіч, Эдуард Акулін. Дыск вабіць нават імёнамі не надта прыкмечанымі ў бардаўскай творчасці, але таксама чутымі многімі з вас: Сяржук Кулягін, Серж Мінскевіч, Раман Абрамчук, Вольга Акуліч, Андрэй Хадановіч, Лявон Тышкевіч, Юры Несцярэнка, Піт Паўлаў, Ігар Загумёнаў. Нехта рокер, нехта паэт, нехта рэжысёр... І гэта не азначае, што раз я кагосьці не назваў, дык яны горшыя. Зусім не. Проста задужа матэрыялу для асэнсавання, таму на маю ўвагу ўплывае процьма разнастайных прычынаў. Вунь жа нават знакамітыя Барыс і Галіна Вайханскія прапанавалі ў гэты праект некалькі беларускіх песень!

Найперш мяне як слухача ўразіў згаданы наваполацкі экс-панк Ален, якому ў 1990-я гады прарочылі грандыёзную попкар'еру, яго праслухоўваў нават маэстра Фінберг, а вось нешта не склалася. А потым зняважлівая нашаніўская рэцэнзія на ягоны CD-альбом, якою нехта хацеў закрэсліць папярэднія спадзяванні касетнага веку. І вось тут сама гутарка з ім апынулася адной з найцікавейшых, найшчырэйшых і хвалюючых. А песні? Ён хоць і кінуў сваё поп-хуліганства («Ах, Аліса, прыгожая дзяўчынка з сэксуальным адхіленнем!»), але працягвае бянтэжыць і здзіўляць слухача.

Неверагодным парадоксам разгарнуўся рэжысёр-кінадакументаліст Алег Дашкевіч. Ведаў яго асабіста, але і не падазраваў, што ён цудоўна спявае, сам піша проста дзівацкія песні. Як, напрыклад, раманс пра Экскаватарны завулак або пра прыгоды камісара ў мінскім лесе. Нават уявіць сабе немагчыма танга пра лесавіка, злачынства... Самому Шалкевічу з ягоным «Патрыятычным танга Цнота» давядзецца пацясніцца.

Чым цікавы ўсялякі музычны прадукт? Ну, безумоўна, не тым, што артыст «нотка ў нотку трапляе», як патрабуюць на тэлевізійных спаборніцтвах. Нікога не зацягне тая завучаная нотка, калі артыст не здзіўляе слухача, не зачароўвае нейкай надзвычайнай цеплынёй. Дык вось «Сто бардаў Свабоды» і зачароўваюць, і дзівяць. Нават цалкам невядомыя імёны! Бо слушна сказаў у пачатку прыгаданым інтэрв'ю знакаміты музыколаг Анатоль Мяльгуй: «Праект гэты вельмі патрэбны і для саміх выканаўцаў, і для музычных крытыкаў. Там шмат цікавых і адметных: Дар'я Кадамская мне вельмі спадабалася, Раман Яраш – бард з надзвычай своеасабліваю стылістыкай. А для музычных крытыкаў гэты дыск – яшчэ адно пацверджанне, што нашая бардаўская песня развіваецца ў накірунку нацыянальным. Іншага прадукцыйнага шляху ў яе няма. Праўда, трэба шукаць свае шляхі, свае адметнасці, сваю тэматыку, свайго лірычнага героя».

Апра само выданне варта яшчэ прыгадаць каментар да інтэрнэт-публікацыі таго інтэрв'ю: «***Benik:*** Дзіўная рэч – у дыск «100 бардаў Свабоды» разам з навінкамі ўвайшоў увесь першы дыск «Барды Свабоды». Дык што, трэцім будзе «150 бардаў Свабоды» з двума папярэднімі?»

Адна праблема ў новай кружэлкі – гігантаманія: 626 трэкаў. Мо, «Mazda-626», на якой ездзіць спонсар, падказала гэты выбар. А яшчэ праблема – не спявае вялікі Бартосік, ён жа вядоўца тут.

Вітаўт МАРТЫНЕНКА,
музычны крытык

Жывёльны свет у беларускім фальклоры

Уздоўж

1. Насякомае, якое ніколі не спіць і ў якога самы вялікі мозг у адносінах да цела. **4.** Вялікі князь ВКЛ, якому, паводле падання, прысніўся жалезны воўк, што з'явілася падставай для заснавання князем Вільні. **7.** ... і Гаўры. Мянушка любімых сабак міфічнага першанасельніка Беларусі князя Бая: па слядах, дзе сабакі беглі, пацяклі, паводле падання, Дняпро і Дзвіна. Напярэдадні Сёмухі штогод адзначаліся ... Дзяды. **8.** Хоць трэсні, ..., а не быць жураўлём (прык.). **10.** Гора табе, ..., калі цябе карова коле (прык.). **11.** ... Чарадзей. Полацкі князь, які, паводле былінаў, мог абарочвацца ў розных звяроў і птушак. **12.** Вадзяны .... Будынак для размолу зерня: раней на ім абавязкова трымалі чорных ката і пеўня – як лепшую ахвяру вадзяніку. **15.** Летам і ... – прачка (прык.). **16.** «Клякоча ... і, абмокшыя, ўсё ранне // Працяжна каркаюць вароны ў тумане». З паэмы А. Міцкевіча «Пан Тадэвуш». **17.** «Лятуць гусі ў Край Радзімы, // бы ... ляціць». З верша Л. Геніюш «Лятуць гусі». **19.** Свойская жывёла, якую ў Расіі ў XVII ст. прыгаварылі да ссылкі ў Сібір (потым дабраліся і да беларусаў). **22.** Грозен рак, ды ззаду ... (прык.). **23.** Калі ідзеш на мядзведзя – сцялі ..., а калі на дзікага кабана – пасылай па папа (прык.). **26.** Продаж гатовай прадукцыі. **29.** Росквіт чаго-небудзь (кніжн.). **30.** Рыба і зайцы завядуць у ... (прык.). **31.** Зона найвялікшых акіянічных глыбінь. **32.** Сей ячмень, як загудзе ... (прык.).

Упоперак

1. Той, хто вядзе работу з масамі. **2.** Жаўранак прылятае на праталіну, ... на прагаліну, жораў з цяплом, ластаўка з лістом (прык.). **3.** Контур. **4.** Матэрыял, з якога, паводле міфалогіі, былі злепленыя авечка і свіння. **5.** Дзікі кабан: у міфалогіі лічыўся сімвалам баявой магутнасці і ўрадлівасці. **6.** Абазначаная вартасць (спец.). **7.** Чалавек магутнай фізічнай сілы: ім быў, паводле міфа, заснавальнік Мінска – Менеск. **9.** Апякун статка: на іконах заўсёды маляваўся акружаны каровамі, авечкамі. **13.** Вясельны абрадавы пірог, на якім некалі рабіліся выявы вымя і рагоў каровы. **14.** Тое, чым абвязана што-небудзь. **17.** Пушны звярок: у беларусаў лічыцца вялікім грахом забіраць зробленыя ім на зіму прыпасы. **18.** Бег сабачы, брэх сабачы, а не сабака (жарт-загадка). **20.** «Адныя ў пушчы слаўныя ..., // адзіны толькі ў крывічоў Скарына». З верша Л. Геніюш «Адна ёсць толькі ў сэрцы Беларусь». **21.** І над сабакаю трэба ... мець (прык.). **24.** Жвачная жывёліна, якая на нашай зямлі ўшаноўвалася яшчэ ў бронзавым веку. Выява яе ўпрыгожвае герб Гродна. **25.** Паўднёвая вадзяная расліна. **27.** «... пяе песню разлукі, // Лапоча крыламі кажан». З верша Купалы «Заклятая кветка». **28.** Буйная нёманская вёска на Шчуччыне.



Склаў Лявон ЦЕЛЕШ

«Чара» беларуска-шведская

Традыцыйныя Дні культуры Швецыі ў нашай краіне ўжо сталі падзеяй значнаю і нават чаканаю многімі. Сёлетнія мерапрыемствы доўжыліся амаль месяц, імпрэзы праходзілі не толькі ў Мінску, але і ў іншых гарадах краіны.

Распачаўся своеасаблівы фестываль культуры канцэртам гурта «Hedningarna» (назва перакладаецца як «язычнікі») у мінскім Палацы культуры ветэранаў. Музыкі захапляюцца шведскай і фінскай фольк-музыкай, таленавіта сплятаюць традыцыйнае гучанне з электронным, поруч з электрагітарамі на канцэртах народныя інструменты, лютня, дрымба. Другі калектыў, які завітаў сёлета ў Беларусь, – Камерны хор Святога Юханэса з Стакгольма. Амаль за дзесяць гадоў свайго існавання хор можа пахваліцца даволі шырокім і разнастайным спектрам выканання – ад класічных араторыяў і традыцыйнай акапэльнай музыкі да перформансаў і сцэнічных пастановак. З калектывам супрацоўнічаюць вядомыя шведскія выканаўцы: саксафаніст Андэш Паулсан, арт-дуэт Лісэ і Гертрут, сімфанічны аркестр «Про Музыка», спявак Еспер Таба ды іншыя. Камерны хор выступіў у Малой зале Белдзяржфілармоніі і ў канцэртнай зале полацкага Сафійскага сабора (там – разам з хорам «Concordia»).

Цягам трох чэрвеньскіх дзён у трох беларускіх гарадах – Мінску, Пінску і Брэсце – прайшлі шведска-беларускія літаратурныя чытанні. З нашага боку ў імпрэзах бралі ўдзел Алесь Пашкевіч, Аксана Спрынчан і Усевалад Сцебурака, з шведскага – Катарына Фростэнсан, Ула Лашму і Ульф Старк, вёў чытанні вядомы артыст, бард і пісьменнік Віктар Шалкевіч.

Цікавосткаю сёлетніх дзён культуры стала прэзентацыя беларуска-шведскага музычнага праекта – альбома Змітра Вайцюшкевіча «Чара». У ім – песні, створаныя Вайцюшкевічам на вершы вядомых сучасных паэтаў Катарыны Фростэнсан, Крыстофэра Леандуэла, Кенэта Клемэтса. На беларускую мову творы пераклалі Рыгор Барадулін, Алесь Разанаў і Дзмітрый Плакс. Ёсць у новым альбоме і дадаткі – песні, што перагукаюцца з ідэяй праекта. Песня на верш Андрэя Хадановіча «Беларускія мужчыны» перагукаецца з песняй «Шведскія мужчыны» (праўда, параўнанне атрымалася не на карысць нашых суайчыннікаў – ці тое шведы захапіліся самарэкламаю, ці тое нашыя – самакрытыкаю ды самаіроніяй...). Другую песню, на верш Барбру Ліндгрэн, па-шведску заспявала Аляксандра Эрыксан. Прэзентацыя кружэлкі ў Швецыі прайшла 2 мая ў Паўднёвым тэатры Стакгольма. У нашай краіне праект быў прадстаўлены 1 чэрвеня (а паколькі меў немалы поспех, то 7 чэрвеня прайшоў дадатковы канцэрт). І нават на другім канцэрце зала была поўнаю, а сярод гледачоў былі й тыя, хто прыйшоў на «Чару» другі раз.

З. Вайцюшкевіч граў са сваім «WZ-orkiestra». Кожнай песні папярэднічалі расповеды пра аўтараў вершаў, спявак і кампазітар дзяліўся гісторый напісання таго ці іншага твора, сваімі ўражаннямі пра Швецыю, рабіў паралелі між дзвюма краінамі. Як сталася, іх не так і мала. Нямала добрых словаў было сказана і на адрас пасла Каралеўства Швецыя Стэфана Эрыксана, які адгукнуўся на прапанову стварэння ў Беларусі песеннага альбома на вершы ягоных землякоў.

Акрамя гэтага ў рамках дзён культуры прайшлі выстаўка карыкатуры «Сам-насам з кліматам» і фестываль шведскага кіно (дэманстраваліся мастацкія фільмы «Дзяўчынка», «Добраахвотна-прымусова» і «Сумнеўна», дакументальны «Падпарадкаванне»).

Уладзімір ПУЧЫНСКІ
Фота аўтара і Наталі КУПРЭВІЧ

Малая краязнаўчая энцыклапедыя

Пачатак у № 1 за 2003 год)

Лі́с Арсень Сяргеевіч (н. 04.02.1934, в. Вётхава Смаргонскага р-на) – беларускі фальклярыст, доктар філалагічных навук, сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў, літаратуразнавец. Скончыў БДУ (1956). Працаваў настаўнікам, загадваў педкабінетам РАНА ў мястэчку Шаркаўшчына ў Віцебскай вобл., рэдактарам у Дзяржаўным выдавецтве БССР, з 1962 г. – навуковы супрацоўнік Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР. Друкуецца з 1955 г. Даследуе каляндарна-абрадавы фальклор. Аўтар манаграфіі «Купальскія песні» (1974), нарысаў пра жніўную, восеньскую, талочную народную паэзію, адзін з аўтараў падручніка «Беларуская народна-паэтычная творчасць» (1979), укладальнік зборніка «Беларускія народныя песні» (1970), некаторых тамоў серыі «Беларуская народная творчасць» («Жніўныя песні», 1974; «Восеньскія і талочныя песні», 1981), у 2010 г. выйшаў збор твораў «Gloria victis!», сааўтар сцэнарыяў дакументальных фільмаў пра Максіма Гарэцкага, Мітрафана Доўнар-Запольскага, Аркадзя Смоліча, Браніслава Тарашкевіча, Аляксандра Уласава, Рыгора Шырму. Даследуе гісторыю культуры, піша пра вучоных, мастакоў, музыкаў, народных спевакоў. У нарысах і эцюдах спалучае навуковы падыход да тэмы з выразнасцю мастацкага пісьма.



Лі́таўры (відаць, ад позне-грэчаскага polytaurea ад грэч. poly шмат + taurea барабан) – старажытны мембранны ўдарны музычны інструмент, вядомы многім народам. Назва ў множным ліку абумоўленая традыцыяй выкарыстання парамі. Маюць катлападобны металічны корпус-рэзанатар, адкрыты бок якога зацягнуты скураной мембранай. Пры ўдары па ёй 2 драўлянымі калатушкамі ўзнікае гук акрэсленай вышыні. Поўны камплект сучасных літаўраў уключае да 5 інструментаў розных памераў і наладкі.

У Беларусі паводле этнаграфічных крыніцаў XIX ст. літаўры называліся катламі, выкарыстоўваліся ў некаторых народных абрадах (валачобным, купальскім), а таксама паўстанцамі 1863–1864 гг.

Газета зарэгістравана ў Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне № 384 ад 15 мая 2009 г. Заснавальнікі: грамадскае аб'яднанне «Беларускі фонд культуры», вытворчае прыватнае унітарнае прадпрыемства «Светач», Гілеп Уладзімір Аляксандравіч.

Краязнаўчая газета

Індэкс індывідуальнай падпіскі – 63320
ведамаснай – 633202

Галоўны рэдактар – Уладзімір ГІЛЕП.
Намеснік галоўнага рэдактара Уладзімір Пучынскі.
Рэдкалегія: Анатоль Бутэвіч, Андрэй Вірчак, Анатоль Грыцкевіч, Алесь Карлюкевіч, Лідзія Кулажанка, Адам Мальдзіс, Вячаслаў Рагойша, Віталь Скалабан, Віктар Хурсік.

Наш адрас: 220029, г. Мінск, вул. Траецкая набярэжная, 6. Тэл. 283 28 26, 334 61 62. Тэл./факс 334-42-03 E-mail: kraga@tut.by

З-за абмежаванасці сродкаў выданне безганарарнае. Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, імя і імя па бацьку, асноўнае месца працы, зваротны адрас. Меркаванні аўтараў могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў. Пры перадруку спасылка на «Краязнаўчую газету» абавязковая.

Падпісана да друку: 16.06.2011. Газета надрукавана ў друкарні ТДА «Знамение» (Мінск, вул. Каржанеўскага, 14). Ліцэнзія ЛП № 02330/0150475 ад 25.02.2009.

Заказ 600. Тыраж 1160 асобнікаў.